16.20 Анна Карэніна
18.10 Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча
18.35 Як правільна старэць?
19.00 Эксперт
19.30 Палігон
20.20 Серыйныя забойствы ў краіне Пуціна
21.15 «Два жыцці»
21.25 Два жыцці
23.05 Вандроўнчы ўздоўж Вялікага муру
00.00 Найвярнейшы жаўнер Гітлера


Басня Крылова	Иномарка	Стих Ахматовой	Мохаммед ...	Мать богов	Ворох бумаг
Мудрая птица	Лек. растение	Зимняя повозка	Общесемитское божество	«Духовник» мусульман	Героиня «Челюстей»	Ладья

ЛИНЕЙНЫЕ КРОССВОРДЫ ОТ ВЛАДИМИРА ВАШУТЫ



Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ
Уласны карэспандэнт
«ГС» на Дзятлаўшчыне
Адрас: 231471, г. Дзятлава, а/я 31
Email: 375299518893@yandex.by

ЛАЎКА ПАД БЭЗАМ



МАЛЮНАК ЯЎГЕНА ІВАНОВА

— Ці ведаеш, што твая Галя ўжо з хлопцам ходзіць? — абапёршыся аб брамку, што злучала іхнія агароды, спытала Вера Рамоніч у суседкі. Альбіна Капкоўская кінула дзябку, якой асыпала бульбу, і, выцершы ражком сіняй у белыя крапінкі хусцінкай узмакрэлы лоб, са скрухай прамовіла:

— А што я ёй зраблю? Каб былі жывыя бацькі, то трымалі б у большай строгасці, а я нават крычаць на яе не магу. Шкадую, бо з трох гадкоў сірата. Здаецца ж, нядрэнную дзяўчыну выгадавала: і вучыцца выдатна, і па гаспадарцы мне дапамагае. Цяпер во паехала на самаробным вазку за выган па траву для авечак.

— Не крыўдуй хаця, суседачка. Я ж не кажу, што твая ўнучка вырасла гультайкай ці якой недарэкай. Усе ў нашай вёсцы Хільманоўцы ведаюць, якая Галінка слаўная, ды з хлопцам сябраваць ёй рана. Яшчэ толькі сёлета абое закончаць сярэднюю школу.

Галя сябравала з Ігарам Высоцкім ужо цэлы год. Ды што там сябравала... У іх было чыстае і такое гарачае першае каханне. Ён і ў школу яе праводзіў, і пасля заняткаў яны вярталіся разам. Абое вырашылі паступаць у педагагічны інстытут. А потым, як атрымаюць дыпломы, то і пажэняцца.

Усякае гаварылі пра іх у вёсцы, толькі гэтага ўсякага не было.

— Не такі мой сын, каб дазволіць сабе нешта лішняе, — заступалася за маладых Ігарава мама Валя, якая была прадаўцом у сельскім магазіне. — Галечка — дзяўчына харошая, я нават рада, што ў іх такія шчырыя адносіны.

Як атрымалі атэстаты, адразу падалі дакументы ў Гродзенскі пединстытут. Потым паехалі на экзамены.

Ігар праваліўся на першым.

— Не сумуй, на другі год паступіш, — суцяшала Галя.

— На другі год мяне забяруць у армію, а пакуль адслужу, то многае забудуся. Ды і ахвота паступаць прападзе, трэба будзе хутчэй набыць якую прафесію і дапамагаць маме гадаваць малодшага брацiка. Бацька ж кінуў нас, як толькі Міколка нарадзіўся.

Адслужыўшы, Ігар і сапраўды паехаў у раённы гарадок, набыў спецыяльнасць вадзіцеля. Галя часта прыязджала ў вёску да бабулі, ва ўсім ёй дапамагала. Ігар таксама дапамагаў, бо ў гаспадарцы патрэбны былі мужчынскія рукі. Маладыя людзі вырашылі пажаніцца адразу, як дзяўчына атрымае дыплом.

— Бабулька, я хутка замуж пайду! — радасна паведаміла Галя. — За Ігара!

— Ні за што на свеце я не дазволю вам пажаніцца! — заламантавала старая Альбіна. — Не пара ён табе! Ну, сябравалі, хадзілі разам, а цяпер вы на розных сцежках. Ты інстытут закончыла, настаўніца. А ён хто? Баранку круціць на калгасным грузавіку. Будзеш увесь век гібець з ім у вёсцы. Не для таго я цябе столькі гадоў вучыла з апошніх сіл, каб дапусціць гэта.

Размова адбылася летнім адвячоркам, калі Галя радасная збіралася на спатканне з Ігарам. Ведала, што ён прыйшоў з работы раней і ўжо чакае на лаўцы пад вялікім кустом бэзу, што на самым ускрайку вёскі, акурат насупроць хаты адзінокай старой Вікці Маркоўскай. Бабуліны словы патушылі гэту радасць, нібы вецер маладзенькі агеньчык вогнішча. Яна, нічога не кажучы, накінула на плечы чырвоную кофту і падалася з хаты. Высокая, стройная, з густымі чорнымі валасамі, сабранымі на патыліцы і закручанымі ў тугую куклу, яна не ішла, а бегла да той лаўкі.

— Ігар, міленькі, бабуля не дазваляе мне выйсці за цябе замуж! — села і, закрыўшы твар рукамі, горка заплакала.

— Супакойся, Галечка, — ён не мог глядзець на слёзы каханай і суцяшаў яе. — А чаму не дазволіць? Чым я правініўся? І дапамагаю ёй, і не пакрыўдзіў ніколі... — па смуглым мілавідным твары хлопца прабег цень трывогі.

— Яна не хоча, каб я ўсё жыццё пражыла ў вёсцы. Лепшай долі для мяне, бачыш, хоча, а не разумее таго, што без цябе мне добрай долі не будзе... Я цябе вельмі люблю, але і насуперак бабцы пайсці не магу, бо яна мне замяніла маму і тату. Хоць і цяжка было, а выгадавала, дала адукацыю...

— Ну, рашай сама, — з крыўдай прамовіў Ігар і падняўся з лаўкі. — Раз так, то ў мяне няма слоў...

Ён пайшоў у вечаровы змрок, пакінуўшы Галю ў адчаі і адзіноце.

Назаўтра яна паехала ў інстытут атрымліваць дыплом, а Ігар паехаў у Латвію на пахаванне дзядзькі, мамінага роднага брата. А яшчэ праз пару дзён па вёсцы папаўзлі чуткі, што Галя раптоўна выйшла замуж за нейкага лейтэнанта і паехала з ім на Далёкі Усход. Яна ўцякала ад сябе, ад свайго кахання.

Адкуль узяўся той лейтэнант, растлумачыць не магла нават старая Альбіна, бо сама нічога не ведала і ў вочы яго не бачыла. Унучка не прывозіла, каб пазнаёміць з бабкай, а толькі забрала з дому свае рэчы. Альбіна была ў роспачы:

— Не чакала я ад унучкі такой неспадзяванкі, — казала суседкам. — Думала, на старасці будзе мяне даглядаць, а тут на табе... Гадавала-гадавала, і ніякай падзякі.

— То ты ж не хацела, каб яна ў вёсцы жыла, бо надта вучоная, Ігар ёй не пара. Вось цяпер і маеш. І Галя паехала, і ён цяпер табе нічым не дапаможа, бо вельмі пакрыўдзіўся. Будзеш адна кукаваць. А як трэба што зрабіць па гаспадарцы, то апойкаў ноймеш і заплаціш ім як мае быць. Сама сабе ты нарабіла такіх клопатаў, — казала Вікця Жыбарт, што жыла на другім баку вуліцы, акурат насупроць Альбінінага дома.

Зрэдку Галя прысылала бабулі пісьмы, іншы раз і грашовыя пераводы прыносіла паштальёнка Іра Мірончык.

— Ну, як там унучка жыве? — часта пыталі вясковыя бабы. — Нешта ж не прыязджае.

— Наездзішся з-за свету, — плакала Альбіна. — А як жыве, то хіба я ведаю? Дзетак у іх з тым вайскоўцам няма, то такое яно і жыццё без дзетак... Яна не жаліцца, але я і сама разумею.

Аднойчы зімой, несучы са студні ваду, старая Альбіна паслізнулася ля ганку і зламала шыйку бядра. Замерзла б, ляжачы на снезе, але конюх Іван Хармінскі ішоў на работу і ўбачыў, выклікаў хуткую.

Амаль месяц праляжала бабка ў бальніцы, і ў яе пачалося запаленне лёгкіх. Праз тыдзень сканала. Галі, канешне, ніхто пра гэта не паведаміў, бо падумалі, што ўсё роўна не прыедзе. А каб і наважылася ехаць, то хто будзе чакаць яе з такой далечыні. Вяскоўцы пахавалі самі. І толькі праз тыдзень, калі Галя прыслала бабцы пісьмо, суседкі вырашылі напісаць ёй пра ўсё.

...Яна вярнулася ў вёску праз шмат гадоў, калі ўжо састарэла. Пахавала мужа, і заставацца адной у пустой кватэры ў чужой старонцы стала нясцерпна цяжка. З болем у сэрцы ступіла на вуліцу вымірающай вёскі і жахнулася ад таго, што ўбачыла. Развалілася хата Вікці Маркоўскай, і на страху палезла кустоўе бэзу. Ён тут наогул разросся, нібы лес, ужо заняў некалькі апусцелых падворкаў. Ля гнілога плоту пакасілася лаўка, нібы чалавек, якому пакалечылі нагу. Хацела прысесці і крыху адпачыць, але толькі дакранулася, як лаўка развалілася зусім. Пайшла далей, бо ўжо былі відаць аблезла-сінія вокны роднай хаты, якая ў параўнанні з другімі яшчэ мела нядрэнны выгляд. Раптам убачыла, што па вуліцы насустрач ідзе купка людзей, за імі машына. Уперадзе стары чалавек нёс крыж, але яна не змагла прачытаць надпіс. Спытала ў кабеты, якая несла адзіны вянок:

— Хто памёр?

— Ігар Высоцкі. Як жыў бабылём, так і памёр у адзіноце, зямелька яму пухам...

Галю ніхто не пазнаў, і яна не пазнала нікога. Павярнулася і пайшла ўслед за пахавальнай працэсіяй да недалёкага сасоннiку, дзе былі вясковыя могілкі...

КУЛЬТУРА

ПРА ГОНАР НАЦЫІ



Пра выставу расказвае бібліёграф раённай бібліятэкі Ганна Лашчэўская

У Дзятлаўскай раённай бібліятэцы аформлена выстава, якая расказвае пра гонар беларускай нацыі — пісьменнікаў Кандрата Крапіву, Максіма Багдановіча, Івана Шамякіна, кампазітара Уладзіміра Мулявіна і іншых.

Выстава перасоўная. З ёй бібліятэкары пабывалі ў райаддзеле МНС, Дэпартаменце аховы і іншых установах. Неўзабаве маюць намер завезці выставу ў лясгас і на сыраробчы завод, дзе таксама раскажуць людзям пра славутых людзей беларускага краю.

ФОТА АЎТАРА

Язэп ПАЛУБЯТКА
Уласны карэспандэнт «ГС» у Мастах
Адрас: 231600, праспект Юнацтва, 12/21
Email: jazep.2004@tyt.by
Тэл: +37529 126-46-92



18 траўня 2016 года №21 (989)

АДРАПАРТАВАЎСЯ ВЯЛІКАМУ СХОДУ РАМОНТАМ ГНІЛОГА ПЛОТУ

Старшыня Курылавіцкага сельсавета Сяргей Каспяровіч як вялікае дасягненне ў сацыяльнай сферы работы сельсавета адзначыў, што ў Рудзе Ліпічанскай ветэрану Вялікай Айчыннай вайны Марыі Жукавай работнікі цэнтра сацыяльнага абслугоўвання адрамантавалі плот.

Цяпер на тэрыторыі сельсавета знаходзіцца больш за сорак населеных пунктаў, дзе пражывае каля трох тысяч чалавек. Палова з іх — людзі састарэлага ўзросту, і амаль ля кожнай хаты — гнілы плот.

ПРАВІЛЫ РУХУ НЕ ДЛЯ МІЛІЦЫЯНЕРАЎ?

Нядаўна стаў сведкам такога факта. Прыкладна ў 19 гадзін 6 траўня мне давялося пераходзіць вуліцу Леніна ў Мастах. Ужо знаходзіўся на «зебры», як на вялікай хуткасці за два крокі ад мяне пранеслася міліцэйская машына.




Перайшоўшы вуліцу, патэлефанаваў у райаддзел дзяжурнаму. Назваў месца, час падзеі, нумар машыны і г. д. Дзяжурны інфармацыю прыняў. Праз нейкую гадзіну да мяне дадому прыехала патрульная машына ДАІ. Старшы лейтэнант Пляскач склаў падрабязны праткол здарэння. На пакаранні парушальніка правілаў дарожнага руху я не настойваў, але папрасіў правесці прафілактычную гутарку, бо не да твару чалавеку, пастаўленаму ахоўваць закон, парушаць яго.



На мінулым тыдні атрымаў ліст за подпісам намесніка начальніка РАУС падпалкоўніка С. Нікіціча, дзе сказана наступнае: «...вынесена пастанова аб спыненні справы аб адміністрацыйным правапарушэнні за адсутнасцю падзеі адміністрацыйнага правапарушэння». Правільней было б напісаць — не «падзеі», а «факта». А вось факт быў, і былі сведкі, якія выказаліся ў адрас вадзіцеля даволі ёмка. Толькі тых сведак не сталі прыцягваць да справы.

З гэтай нагоды падпалкоўнік Нікіціч робіць высновы, што ў вадзіцеля аўтамабіля аператыўнага прызначэння парушэнняў правілаў дарожнага руху няма.

МОСТОВЧАНЕ ПОЗАБОТИЛИСЬ О БАБОЧКАХ И БОЖЬИХ КОРОВКАХ





Домик на высоте



Домик установлен

Домики для бабочек и насекомых появились на деревьях дендропарка города Мосты. В необычном жилье полезные насекомые смогут жить и прятаться от летней жары. Мероприятие было организовано активистами общественной инициативы «За европейскую Мостовщину».

Мы часто задумываемся о пользе птиц в городских парках, садах и приусадебных участках и даже можем повесить для них весной скворечники, а осенью — кормушки. Но почти не думаем о том, что можно повесить домики для бабочек и полезных насекомых.

«Эта идея возникла у мостовчан после путешествий в Польшу, Литву, Чехию. Группа молодых мостовчан обратилась к нам с идеей создания домиков для полезных насекомых. Мы решили, что лучшим местом для их размещения будет дендропарк. Это важно и для того, чтобы обратить внимание общественности на проблемы главного городского парка. Дендропарк — одна из изюминок нашего города, которая требует реконструкции, внимания и заботы. Я убежден, что совместными усилиями общественных организаций, граждан и местной власти нам удастся вдохнуть новую жизнь в функционирование парка», — сказал активист ОИ «За европейскую Мостовщину» Василь Климович.

В ближайшее время общественные активисты планируют заняться проблемой запущенности мостовского дендропарка и продолжить мероприятия по привлечению внимания к проблеме благоустройства парка, основанного в честь 500-летия первого упоминания о Мостах.

По материалам masty.eu

ЮБІЛЕЙ БЕЗВЫНІКОВАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА



20-гадовы падмурак у цэнтры Мастоў

Сёлета спаўняецца 20 гадоў з дня стварэння сумеснага чэшска-мастоўскага сумеснага прадпрыемства «МостЭдэн».

Арганізавалася яно на базе ААТ «Мастоўдрэў». Напачатку гэта быў цэх вытворчасці дзвярных палотнаў. Надзеі кіраўнікоў праекта былі велізарныя. Пачалося будаўніцтва шыкоўнага офіса. Многія, хто меў дачыненне да гэтага, хваліліся: «Офіс будзе самым прыгожым будынкам у Мастах».

Месца выбралі прыдатнае, у цэнтры горада, на вуліцы Савецкай, насупраць былога гарадскога рынка. Увішна шчыравалі будаўнікі ААТ над закладкай фундамента. Патрабавальныя чэхі прымушалі іх па некалькі разоў перарабляць фундамент нават пад перагародкі.

Незаладзілася і з выпускам прадукцыі. Неўзабаве чэхі зразумелі бесперспектыўнасць супольнай працы з мастаўлянамі і адмовіліся ад супрацоўніцтва. Будаўніцтва офіса спынілася на ўзроўні нулявога цыкла.

Закончаная ў мінулым годзе рэканструкцыя ААТ «Мастоўдрэў» паставіла канчаткова прадпрыемства на мяжу банкруцтва. І як помнік «паспяховаму» мастоўска-чэшскаму супрацоўніцтву стаяць пасярод горада зарослыя бур'янам падмуркі.

ФОТА АЎТАРА



Выйшаў чацвёрты нумар краязнаўчага бюлетэня "Слонімскі край"

У новым нумары электроннага выдання чытачы даведаюцца, што пісала пра Слонім 100 гадоў таму нямецкамоўная баранавіцкая газета, прачытаюць пра гісторыю слонімскіх кінатэатраў, пра Слонімскае княства і яго князёў, пра святыя жыровіцкія мясціны і знойдуць яшчэ шмат цікавай інфармацыі пра Слонімшчыну і яе людзей.

Бюлетэнь распаўсюджваецца праз інтэрнэт у PDF-фармаце. У планах выдаўцоў — надрукаваць з часам яго папяровую версію.

Мікола КАНАНОВІЧ

СЛОНІМШЧЫНА НАПЯРЭДАДНІ І ПАДЧАС ПАЎСТАННЯ 1794 ГОДА

Напярэдадні паўстання

У ходзе вайны Рэчы Паспалітай з Расійскай імперыяй 1768-1772 гадоў 33спробу супрацьстаяць ворагу здзейсніў уладальнік Слонімскага старосцтва гетман Міхаіл Казімір Агінскі. Пасля яго паражэння Слонім заплаціў за супраціўленне трохдзённым разрабаваннем войскамі Аляксандра Суворава. У 1772 годзе адбыўся першы падзел Рэчы Паспалітай паміж Расіяй, Аўстрыяй і Прусіяй.


Паўстанцы

Патрыятычна настроеныя колы грамадства шукалі выйсця з цяжкага крызісу, у якім апынулася іх Радзіма, і разлічвалі на правядзенне шырокага кола рэформ. Менавіта з мэтаю іх распрацоўкі і далейшага ажыццяўлення працаваў Чатырохгадовы сойм (1788-1792), названы сучаснікамі «Вялікім» — не толькі за працягласць яго дзеяння, але перш за ўсё за характар важных рэфарматарскіх рашэнняў. У яго працы прымалі ўдзел паслы Слонімскага павета — Станіслаў Солтан (харунжы ВКЛ, слонімскі староста) і Казімір Ян Глаўбіч Пжэцлаўскі (слонімскі пісарчук). Да іх у снежні 1790 года далучыліся яшчэ два паслы ад Слонімскага павета — Ксаверы Зянкевіч і Войцех Пуслоўскі. Менавіта на Чатырохгадовым сойме 3 мая 1791 года была прынята першая ў Еўропе і другая ў свеце, пасля ЗША, Канстытуцыя.

Сярод рашэнняў сойма было стварэнне ў дапамогу арміі ў павятовых цэнтрах грамадзянска-вайсковых камісій, адна з якіх паўстала ў Слоніме. Яе мэта — вырашэнне пытанняў паміж вайсковымі і цывільнымі ўладамі, датычных забеспячэння арміі, яе раскватаравання, рэкрутавання і барацьба з дзезерцірствам.

Вайна 1792 года

Супраць узмацнення суседа і правядзення ім усялякіх рэформ выступіла Расійская імперыя на чале з імператрыцай Кацярынай II, якая ў маі 1792 года накіравала ў Рэч Паспалітую 100-тысячную армію. Адна з калон варожай арміі на чале з генералам Ферзенам рухаецца ў бок Слоніма. Ім напярэз з Гродна 29 чэрвеня накіроўваў свае войскі генерал-маёр М. Забела, незадоўга да таго абвешчаны галоўнакамандуючым.

4 ліпеня руская армія ўжо пад Зельвай. Пры пераправе праз Зяльвянку разгарэлася гераічная абарона моста праз раку, дзе 500 жаўнераў ВКЛ на чале з капітанам Іосіфам Сулкоўскім супрацьстаяў шасцітысячны корпус. М. Забела вымушаны быў адступіць, паколькі на дапамогу Ферзену падыходзіў другі расійскі корпус генерала Меліна.

Пасля паражэння ў вайне 23 студзеня 1793 года адбыўся другі падзел Рэчы Паспалітай паміж Расіяй і Прусіяй. Спробы выхаду дзяржавы з крызісу шляхам рэформаў былі прыпынены. Пытанне яе далейшага існавання ў цэню магутных суседніх імперый заставалася справай часу.

Няздольнасць штосьці змяніць выяўлялася ў адсутнасці ўсялякай праграмы далейшых дзеянняў. У студзені 1793 года, напрыклад, была ўтворана Слонімская кашталянія на чале з павятовым маршалкам Янам Казімірам Макавецкім, які стаў называцца кашталянам. Але ўжо 20 снежня 1793 года гэтая пастанова была адменена каралеўскім універсалам.

Тадэвуш Касцюшка

Апошнім шанцам змяніць сітуацыю ў Рэчы Паспалітай стала паўстанне 1794 года, якое ў сакавіку-лістападзе ахапіла яе ўцалелую пасля двух падзелаў тэрыторыю. Кіраўніком паўстання стаў ураджэнец Слонімшчыны Тадэвуш Касцюшка (1746-1817).

Поўнае імя Касцюшкі — Андрэй Тадэвуш Банавентура. Ён нарадзіўся ў фальварку Мерачоўшчына Слонімскага павета і быў 12 лютага 1746 года ахрышчаны ў Косаўскім касцёле. Пасля паспяховага заканчэння Варшаўскага кадэцкага корпуса быў накіраваны для працягу вучобы ў Парыж. Але пасля вяртання на Радзіму не змог працаўладкавацца ў войску Рэчы Паспалітай, паколькі не меў грошай для куплі афіцэрскай пасады. Таму адправіўся ў Паўночную Амерыку на дапамогу англійскім каланістам, якія пачалі вайну супраць Брытанскай імперыі. У 1784 годзе Касцюшка вярнуўся ў Беларусь у арэоле героя новай дзяржавы — Злучаных Штатаў Амерыкі. Але зноў на радзіме яму не знайшлося месца ў войску. Толькі з пачаткам вайны 1792 года ён стаў запатрабаваны. А 24 красавіка 1794 года ў Кракаве абвясціў пра пачатак паўстання, якое ўвайшло ў гісторыю як «паўстанне пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі».

> **На працягу наступных дзён асноўныя паўстанцкія часткі генералаў Серакоўскага і Беляка занялі левабярэжную частку Слоніма. У той час правабярэжнае Замосце апынулася ў руках авангарда расійскага корпуса Дэрфельдэна, якім камандаваў генерал Ласцы.**

Паўстанне

У той жа час да паўстання далучаецца Вільня, дзе на рынку Якуб Ясінскі абвяшчае «Акт паўстання народа Вялікага княства Літоўскага». Утвараўся свой незалежны орган кіраўніцтва — Найвышэйшая Рада ВКЛ, сярод членаў якой слонімскі дэлегат Стэфан Незабітоўскі. Лозунгам Паўстання ў ВКЛ сталі словы «Свабода, Роўнасць, Незалежнасць».

У Слоніме, як і ў іншых павятовых цэнтрах, ствараецца «парадкавая камісія», якая павінна была стаць цэнтрам паўстання на месцы. Яна складалася з сямі аддзелаў: парадку, бяспекі, справядлівасці, скарбу, харчавання, войска і інструкцый. Адначасова такая выконвала функцыі мясцовага самакіравання і з'яўлялася органам цэнтральнай улады. Папярэднікам парадкавай камісіі была грамадзянска-вайсковая камісія, утвораная яшчэ ў час Чатырохгадовага сейма. У іх склад уваходзіў 21 камісар, сярод якіх па 8 чалавек абіраліся з ліку шляхты і мяшчанства, а яшчэ 5 з ліку духавенства. Сялянства ў парадкавых камісіях не было прадстаўлена. Акрамя таго, у кожным павеце абіраўся «генерал зямянскі» ці «генерал міліцыі», які дапамагаў у арганізацыі добраахвотных паўстанцкіх атрадаў.

Але нявырашанасць галоўнага пытання — аграрнага (пазбаўленне сялян ад прыгону і надзяленне іх зямлёю) — не было вырашана, што і прадвызначыла далейшае паражэнне паўстання, для задушэння якога былі накіраваныя расійскія войскі.

Слонімская бітва

У канцы ліпеня на Слонімшчыну Тадэвуш Касцюшка выпраўляе корпус генерала Серакоўскага, які за час свайго паходу па Заходняй Беларусі вырас з паўтары тысячы чалавек да чатырох з паловай тысяч. Яго мэтай было не дапусціць удару ворага на Брэст і прыкрыць Вільню з поўдня. Серакоўскі рухаўся з-пад Высокага праз Шарашоў, і 31 ліпеня яго авангард уступіў у Слонім.

На працягу наступных дзён асноўныя паўстанцкія часткі генералаў Серакоўскага і Беляка занялі левабярэжную частку Слоніма. У той час правабярэжнае Замосце апынулася ў руках авангарда расійскага корпуса Дэрфельдэна, якім камандаваў генерал Ласцы.

Серакоўскі не стаў чакаць падыходу асноўных варожых злучэнняў і 2 жніўня ў 9 гадзін раніцы накіраваў супраць ворага два батальёны і сотню кавалерыі. Нечаканы і рашучы ўдар прымусіў Ласца адступіць. Але пасля гэтага расійскія войскі паспрабавалі вярнуць страчаныя пазіцыі. У выніку да 8 гадзін вечара працягвалася бітва, у выніку якой паўстанцы Серакоўскага страцілі забітымі двух афіцэраў і 15 салдат, яшчэ 31 быў паранены. Расійскія страты былі больш адчувальныя — да трохсот забітых.

Але нягледзячы на відавочны поспех і спрыяльныя ўмовы для далейшага наступу, Серакоўскі пасля Слоніма вырашае адыходзіць да Ружанаў, а потым пад Бярозу. Ён не рызыкнуў пайсці на Вільню, накіраваўшы туды з-пад Слоніма толькі аддзел берасцейскіх добраахвотнікаў-касінераў Франкоўскага. Яны амаль поўнасцю загінулі пры абароне сталіцы ВКЛ 11 жніўня.

Пра сваё адступленне з-пад Слоніма Серакоўскі 5 жніўня паведамляў Тадэвушу Касцюшку, адзначаючы пагрозу яго акружэння падыходзячым корпусам Дэрфельдэна і корпусам Суворава: «Калі ж непрыяцельскую пазіцыю ніякім спосабам атакаваць без вельмі вялікіх страт не мог, а да таго ж, здалося, што, акрамя тых калон, якія маю перад сабой, дзве іншыя хочуць акружыць, віддаць, буду змушаны крыху адступіць да Ружан, каб не падстаўляць флангі».

Не скарыстаўшыся поспехам у Слонімскай бітве, Серакоўскі адступіў пад Брэст, дзе 19 верасня быў разбіты пад Берасцем войскамі Суворава.

Паўстанне Тадэвуша Касцюшкі пацярпела паражэнне, а ў 1795 годзе адбыўся трэці падзел Рэчы Паспалітай, якая канчаткова знікла з палітычнай карты Еўропы.

Васіль ГЕРАСІМЧЫК

Афиша

18-19 мая. Футбол. Юношеское первенство Гродненской области среди футболистов 2001 года рождения. Участие принимают команды Слонима, Новогрудка и Дятлово. Стадион «Газпром трансгаз Беларусь». Начало в 11:00.

21 мая. День физической культуры и спорта. В программе — мини-футбол, перетягивание каната, дартс, стритбол, легкоатлетическая эстафета. Стадион «Юность». Начало в 10:00.

22 мая. Плавание. Открытое первенство города Слонима для всех желающих. Бассейн ФОК Слонимского мясокомбината. Начало в 11:00.

Егор ЖИГАЛИК

18 траўня 2016 года №21 (989)

ФУТБОЛ. ПЕРВАЯ ЛИГА

ЗАЩИТНИК НЕДОЗВОЛЕННЫМ ПРИЁМОМ СВАЛИЛ ИГОРЯ НА ГАЗОН

В пятом туре 26-го национального чемпионата Беларуси по футболу среди команд первой лиги ФК «Слоним» принимал минский «Луч».



Почти каратэ!

Первые моменты в игре были созданы у ворот гостей, но ударов не последовало. Гости лучше преуспели в завершении. После розыгрыша стандартного положения, ввода мяча с аута, к ним пришёл успех — 0:1.

Хозяева после пропущенного мяча сникли, чем незамедлительно воспользовались минчане. Они лучше контролировали мяч, а в одной из атак получили право на штрафной удар. Сильный удар вкупе с рикошетом застал врасплох нашего вратаря — 0:2. После второго пропущенного мяча слонимчане встрепенулись, их атаки стали намного острее. Индивидуальным мастерством блеснул Александр Пузач. После его нацеленной передачи с фланга Олег Герасимчик ударом головой отквитал один мяч — 1:2.

До перерыва у хозяев было два момента, но развития они не получили. После антракта слонимчане лучше вошли в игру, стали чаще наседать на ворота противника, и гол не заставил себя ждать. После длинной передачи в штрафную Владимир Шаков сбросил мяч на набегавшего Александра Пузача — тот не промахнулся — 2:2.

Гости построили свою игру от обороны в надежде на острые контратаки, их прыть на себя принимали защитники, а с ударами справлялся Артём Гомелько. Хозяев вперёд вёл неугомонный Александр Пузач, его рейды по правому флангу не раз ставили в тупик оборону соперника. В добавленное арбитром время Александр в очередной раз без промедления сделал выверенную передачу к воротам минчан на набегавшего Игоря Холодкова, но ударить нападающему помешал защитник, который недозволенным приёмом свалил Игоря на газон. Увы, свисток рефери промолчал. Ничья.

Егор ЖИГАЛИК

ФОТО НИКИТЫ ПАСТУХОВА

ФУТБОЛ. ЮНОШИ

НЕГОСТЕПРИИМНЫЙ ПИНСК

В Пинске прошёл очередной тур юношеского первенства по футболу среди команд первой лиги.



Атака

В старшей возрастной группе среди футболистов 1998 года рождения слонимчане оказали достойное сопротивление хозяевам, и только минутная расслабленность в защите повлекла за собой ошибки и пропущенные мячи.

Гости имели несколько голевых моментов, но реализовать их не сумели и уступили — 0:2.

Во втором матче юноши 2001 года рождения не смогли как следует настроиться на игру против лидера первенства. Уже в первом тайме полешуки забили четыре безответных мяча в ворота слонимчан.

Перерыв пошёл на пользу приезжим спортсменам, которые во втором тайме выглядели намного лучше. Сумели забить мяч престижа. Точный обводящий удар по воротам нанёс Олег Циунчик.

Егор ЖИГАЛИК

ФОТО АВТОРА

ФУТБОЛ. ЧЕМПИОНАТ ОБЛАСТИ

ВСЁ РЕШИЛ ОДИН УДАР

Первую домашнюю игру в этом сезоне проводили футболисты «Слоним Сити». В гости к ним пожаловала самая неудобная команда — сморгонская «Вилия».



Сморгонская «Вилия» — очень неудобный соперник слонимчан

Игра прошла на равных, с переменным успехом в завершении атак. И как неделю назад, единственный точный удар по воротам нанёс Егор Соколовский.

Голевой момент возник после того, как хозяева обосновались на половине гостей. Несколько точных передач позволили им приблизиться к воротам. Ассистировал автору гола Максим Мочалов, который вовремя увидел открывавшегося плеймейкера. Гости не отсиживались в обороне, но их стремления сравнять счёт всякий раз тушили защитники или голкипер хозяев Владимир Корней.

Слонимчанам удалось удержать победный счёт.

Егор ЖИГАЛИК

ФОТО АВТОРА

ПЛЯЖНЫЙ ФУТБОЛ. ВЫСШАЯ ЛИГА

«ФОРСАЖ» ДЕБЮТИРОВАЛ В ВЫСШЕЙ ЛИГЕ

Впервые в истории слонимского спорта команда «Форсаж» дебютирует в чемпионате Беларуси по пляжному футболу в высшей лиге.

Первый тур в Мозыре для слонимчан оказался по-настоящему дебютным — команда не сумела отобрать очки ни у одного из соперников, но показала своё умение бороться до финального свистка. Но всё по порядку.

Ещё нынешней зимой федерация пляжного футбола предложила слонимчанам принять участие в республиканских стартах. Вначале все восприняли это как шутку. От повторного приглашения команда не отказалась.

4 и 15 мая в Мозыре «Форсаж» вписал новую страничку в историю слонимского и белорусского спорта, хотя стартовый матч слонимчане смазали, уступив прошлогоднему серебряному призёру чемпионата — гродненскому «Гроднооблспорту» —1:8 (Денис Куцко).

На следующий день слонимчане выглядели лучше и сумели соперникам навязать свою игру. Во втором матче с минским БГПУ «Форсаж» дважды выходил вперёд — и только нехватка опыта в подобных соревнованиях сказалась на последних минутах игры — 4:5 (Виктор Берг — 3, Денис Куцко).

В последнем матче тура слонимчане уступили мозырской «М-Сити» — 3:5 (Максим Федорчук, Виктор Берг, Сергей Берг).

Один из туров чемпионата планируется провести в Слониме, но для этого нужно строить и развивать соответствующую инфраструктуру.

Егор ЖИГАЛИК



Утверждена Государственная программа «Здоровье народа и демографическая безопасность» на 2016–2020 годы.

Как государство будет улучшать здоровье нации?

А также какие торговые объекты продолжают нарушать санитарное законодательство, читайте в следующем номере «ГС».

КТО И ЗАЧЕМ ДЕЛАЕТ АНАЛИЗ ДНК

В 1995 году белорусы сделали около ста ДНК-анализов. В 2005-м — примерно 500, а в 2015-м — уже почти две тысячи. На четверть из них люди записались сами, без специального решения суда. О том, как, зачем и по какой цене в стране проходят такие исследования, TUT.BY рассказали Сергей Боровко, начальник управления судебно-биологических экспертиз, и Николай Кузуб, заместитель начальника отдела генетических экспертиз Государственного комитета судебных экспертиз.



ФОТО MIOBY.RU

«Мать привела на экспертизу сразу двух мужчин-близнецов определить, кто из них отец ребенка»

— Почему на ДНК-анализ люди стали записываться чаще? Белорусы перестали доверять друг другу или просто насмотрелись ток-шоу, где в последнее время, считай, только о ДНК и говорят?

— Такие программы, наверное, только на свекровей действуют, которые приносят нам снимки внуков и сыновей и доказывают: ну ведь не похожи, — шутит Николай Кузуб. — Сейчас в месяц мы делаем 50-60 экспертиз. Думаю, причина наплыва — гражданские браки, которых стало немало. В начале 2000-х, например, анализы на отцовство делали в основном после разводов. Теперь часто ситуация такова: «мать-одиночка» живет с сожителем. Но отношения вдруг не ладятся, она забирает ребенка и уходит. Юридически у отца на этого малыша нет никаких прав, и все, что ему остается, — сделать ДНК-анализ.

— К тому же за последние 20 лет медицина сильно шагнула вперед. Еще в 80-х вероятность того, что ДНК-анализ на отцовство даст верный результат, была 50-80%. А теперь 99,999… — поддерживает коллегу Сергей Боровко.

— Почему не сто?

— Потому что признаки, которые мы сравниваем, не уникальны и встречаются в популяции с определенной частотой, — поясняет Сергей Боровко. — Встречаются и вообще уникальные примеры. У нас был случай, когда мать привела на экспертизу сразу двух мужчин-близнецов с совершенно идентичным генотипом. Определить, кто из них отец ребенка, не может даже генетический анализ. Читал, в Германии такие исследования проводятся, но они очень дорогие.

— В принципе, стандартные тесты, которые мы используем, наиболее информативны для определения родства первого порядка, то есть между папой и ребенком, — слово за Николаем Кузубом.

— Установить родственные связи второго порядка, предположим, между братьями, уже сложнее. Как-то к нам обратились братья, потерявшиеся еще в блокадном Ленинграде. Друг о друге они узнали уже в преклонном возрасте. Из их объяснения мы поняли, что у них общая мать, а вот отцы разные. Чтобы с уверенностью сказать, что они родственники, понадобилось восстановить связывающую их цепочку наследования. Исследуя родственников потенциального отца по мужской линии, акцентируем внимание на Y-хромосоме. У всех мужчин по отцу она одинакова. У родственников же материнской (женской) линии изучаем митохондриальную ДНК.

Однако если прерывается материнская или отцовская линия, то даже суперприборы не объяснят, являются ли люди родственниками. Например, определить родство дяди и племянницы без данных ее мамы и папы удается нечасто.

— ДНК-анализ может сделать любой желающий?

— Процентов 75 таких исследований люди делают по решению суда. Можно, конечно, провериться и по желанию, — переходит к цифрам Сергей Боровко. — У нас такая процедура стоит около 2,8 млн. рублей. Проводят ее не только в Минске, но и во всех наших областных подразделениях. Знаю, есть и частные организации, которые предоставляют такую услугу. Часто они работают по такой схеме: анализы берут на месте, а затем отправляют их на экспертизу за границу. Однако насколько верны их результаты, судить не берусь. В Беларуси по закону официальный документ с результатами анализов можем выдать только мы.

— Пока ребенку нет 18 лет, на анализ мама, малыш и предполагаемый отец должны приходить вместе, — отвечает Николай Кузуб. — Был период, когда мамы могли не присутствовать на анализе. Тогда, кстати, поток желающих возрос. Папы и свекрови оказались очень недоверчивыми. Оно и понятно, скажет женщина в ссоре: «Это не твой сын» — и всё, мужчина сомневается.

— А если потенциальный отец отказывается проходить ДНК?

— Советуем маме обращаться в суд, — объясняет Сергей Боровко. — Вообще, в случаях, когда людям нужно сделать анализ, чтобы решить спорные вопросы, например, наследства, мы советуем сначала идти в суд. Почему? Потому что во время экспертизы возникают дополнительные вопросы. Например, после смерти человека кто вправе распоряжаться его генетическим материалом?

— И как часто родственники оказываются совсем не родственниками?

— Скажем так, 80-83% из тех, кто делает тест на отцовство, получают положительный ответ, — говорит Николай Кузуб. — Иногда, особенно когда речь идет о разделе имущества, люди настаивают на повторной экспертизе. Потом еще одной. Мы, конечно, не отказываем. Как говорится, любой каприз. Порой доходит и до курьезов. Как-то папа усомнился, что его сын действительно его. Они пришли с мальчиком, результат анализа — положительный, но мужчину это не убедило. Оказалось, гадалка сказала его матери, что ребенок чужой. Они переделали анализ. На выходе — то же. В общем, когда они пришли к нам в третий раз, мы посоветовали им сменить гадалку.

«Вам кажется, что это бывает только в кино, а это наша обычная работа»

— Какие анализы необходимо сдать для ДНК-анализа?

— Для исследования может использоваться что угодно — волосы, ногти, окурки, ушная сера, одежда, — перечисляют специалисты. — Но это все образцы спорного характера. Предположим, тот же волос. Для процедуры его нужно вырвать с луковицей, где и хранится ДНК. Причем ДНК здесь можно выделить очень мало. Так что 98-99% лабораторий мира работают с кровью и слюной. Кстати, чтобы исследование получилось максимально достоверным, берут сразу два этих материала.

— А на анализы материал обязательно сдавать лично? Или те же волосы и ногти можно через кого-то передать?

— Нет, с тем материалом, что кто-то за кого-то доставил, мы не работаем. Представьте, человек принес ватную палочку со слюной. Но кто, кроме него, точно знает, чей это генетический материал? — задается вопросом Николай Кузуб и чуть меняет тему. — Бывают случаи, когда мы делаем исключения из правил. Недавно к нам обратился украинец, отец которого живет в Минске. Папа очень слабый и вряд ли смог бы к нам добраться, а сыну для переезда в другую страну обязательно требовалось подтвердить родство. Пошли им навстречу, и наши сотрудники выехали к ним домой.

— Случается ли, что подтвердить материнство просит женщина?

— Да, но таких случаев у нас бывает в среднем 10-15 в год, — говорит о редких случаях Сергей Боровко. — При этом результаты всех анализов, что мы проводили, были положительными. В основном делают их матери, которые не становятся на учет в женскую консультацию и рожают дома. Позже им нужно доказать, что это именно их ребенок, вот и приходится делать анализ.

Как-то с просьбой сделать анализ для мамы к нам обратилось руководство роддома. Женщине казалось, что ее малыша перепутали. Она паниковала: сначала на ножке была одна бирочка, потом другая. К счастью, результат был положительный.

— А ДНК-анализ может определить предрасположенность человека к болезням?

— Иногда перед серьезной операцией, например по удалению органов, люди хотят удостовериться, что биопсийные материалы, на основании которых им поставили диагноз, принадлежат им и в лаборатории ничего не напутали. Тогда они тоже приходят к нам. Сами же по себе наши исследования явную предрасположенность к тем или иным заболеваниям не показывают.

— Как долго нужно ждать результатов анализа?

— Очередей у нас нет. Если случай типичный, оплачивается в банке положенные 2,8 млн. рублей и направляетесь в процедурный кабинет. Вся процедура займет минут 15. Результаты будут готовы через месяц.


А вообще, многое из того, что, вам кажется, бывает только в кино — наша обычная работа.

news.tut.by

А вы ведалі?

- Чалавечая ДНК амаль такая ж, як і ў салатных лістоў. Па крайняй меры, на 30% ідэнтычна з імі.
- Валасы вашы, калі вы знаходзіцеся на вышыні, паскараюць свой рост.
- Перапалоханыя людзі пачынаюць бачыць лепш.
- Няшчасны задні бок калена! Для яго няма назвы ў многіх мовах (і ў англійскай таксама).

СКАНВОРД «ВОЕННЫЙ»



ОТ ВЛАДИМИРА ВАШУТЫ

СЛОВО-ПАРОЛЬ 1 2 3 4 5 6

Разгадай сканворд и выиграй пиццу!

Ответы на кроссворд — SMS-сообщения с разгаданным словом-паролем — принимаются на номер **8 029 133-04-21 до 20 часов 22 мая.**

Победителем станет наш читатель, чьё SMS-сообщение с правильным ответом придет 10-м по счету! В случае если ответов будет меньше десяти, пиццу получит участник, приславший ответ последним (до указанного времени). С одного номера принимается только одно сообщение.

В прошлый раз был прислан 21 ответ, в т.ч. 1 неправильный.

НАШИ ПОБЕДИТЕЛИ

Победителем прошлого конкурса стал наш читатель с номером +375 44 58xxx50


Ирина Занимонская

Рэтрафота




Фота вядомага амерыканскага фатографа Рамана Вішняка, зробленае ў 1933 годзе ў Слоніме

КАША ИЗ ТОПОРА

ОВСЯНОБЛИН ТЕПЕРЬ В ТРЕНДЕ! И ВАМ ПОНРАВИТСЯ!

Если вы не любите овсянку, овсяноблин — лучшее решение для здорового питания!



Для 1 овсяноблина понадобится:

- 2 яйца;
- 2 ст. л. овсяных хлопьев (овсяных отрубей);
- соль, перец (не обязательно).
- начинка — несколько кусочков колбасы, сыр (начинка может быть любой — на ваш вкус и в любом сочетании: рис, помидоры, огурцы, зеленый салат, овощная смесь, грибы, творог, словом, всё, что найдете в холодильнике).

Взбить вилкой в кружке два яйца, добавить две столовые ложки овсянки. Дать постоять несколько минут и вылить на хорошо разогретую сковородку (смазывать сковородку маслом не нужно!). Закрыть сковородку крышкой. Когда овсяноблин подрумянится, перевернуть его и поджарить с другой стороны. Затем положить на одну половинку овсяноблина порезанную вареную колбасу, натертый сыр, еще раз накрыть крышкой и оставить на огне еще на 2-3 минутки. Сложить овсяноблин пополам и выложить на тарелку. Быстрый, но вкусный и полезный завтрак готов! Такой завтрак или ужин может приготовить себе даже ученик младших классов.

Уважаемые читатели! Присылайте свои рецепты в рубрику «Каша из топора» на электронную почту zhannapleshko@gmail.com или делитесь своими любимыми, а главное, недорогими рецептами по телефону 8 029 133-04-21!

РАСШЫФРУЙ КОД «ГС»

Удзельнік конкурсу, які да 20 гадзін **22 траўня** адправіць SMS-паведамленне з правільным адказам — назвай матэрыялу, дзе прысутнічае такая фраза:

...СТОИТ ПОМНИТЬ...



на нумар **8 029 133-04-21** і гэтае паведамленне будзе **3-м** па ліку, атрымае ў падарунак адкрывалку-падвеску для ключоў.

Пераможцам мінулага конкурсу стаў наш чытач з нумарам +375 33 30xxx89
(усяго было даслана 3 адказы).

Лепшы адпачынак — з "Газетай Слонімскай"!

Старонку падрыхтавала Жанна ІВАНОВА



ВНИМАНИЕ! КОНКУРС «МОЯ СЕМЬЯ» ИДЁТ К ЗАВЕРШЕНИЮ

Выиграет тот участник, чей рисунок насобирает наибольшее количество купонов!

На прогулку всей семьей. Ульяна Герасимчик



38

Отдыхаем весело. Маргарита Михайлова, 8 лет



39

Дружная семья. Дарья Косиченко, 7 лет



40

Наша счастливая семья. Анастасия Игнатик, 8 лет



41

Спортивная семья. Егор Казакевич, 9 лет



42

На прогулке. Валерия Квасова, 8 лет



43

Моя семья. Дарья Стрик, 8 лет



44

Гуляем всей семьей. Кирилл Персиянцев, 9 лет



45

За понравившийся рисунок смогут проголосовать и посетители нашего сайта – GS.BY. Голосование на сайте будет проходить с 18 по 25 мая.

А Вы проголосовали за понравившийся рисунок?

Завершается конкурс детского рисунка на тему «Моя семья».

Мы публикуем последние работы участников конкурса.

Итоги будут объявлены на торжественном мероприятии, на которое будут приглашены все участники.

Стоит отметить, что все работы будут представлены на выставке, которая состоится в детской городской библиотеке.

Уважаемые читатели! У вас ещё есть время проголосовать за понравившийся рисунок! Купоны для голосования будут приниматься до 25 мая.

Напоминаем: для того чтобы проголосовать за понравившийся рисунок, нужно вырезать из газеты купон для голосования, вписать номер рисунка, а также имя и фамилию участника. Купон нужно прислать или принести в редакцию по адресу: 231800, Слоним, ул. Красноармейская, 41 либо Красноармейская, 73б (рекламная служба).

Тот художник, который наберёт наибольшее количество купонов, и станет победителем.

Сейчас лидерами нашего конкурса являются Марианна Кучерова, Илона Каштальян, Полина Володина.

Ф.И.О. ____________

____

____

№ РИСУНКА ____________

Старонку падрыхтавала Таццяна ПЛАХЕТКА
TANYAPLAHETKO@GMAIL.COM, ТЭЛ. 8-029-783-13-99

Намеснік галоўнага рэдактара
Мікола КАНАНОВІЧ
Журналісты
Мікіта ПАСТУХОЎ
Яўген ВАЛАДАШЧУК
Таццяна ДЗЕНІСЮК
Алена КАСЦЮК
Стыль-рэдактар
Жанна ПЛЕШКО
Рэдакцыя сайта www.gs.by
Рэдактар
Дзмітрый МІЦКЕВІЧ
Спецыяліст па рэкламе
Наталля ЦАРОВА

Галоўны бухгалтар
Ганна ВАРАНОВІЧ
Бухгалтар
Вольга БУРСЕВІЧ
Аддзел падпіскі і продажу
Аляксей НАВІЦКІ
8-(029) 322-06-42
Вёрстка і дызайн
Віталь ЕМЯЛЬЯНАЎ
Сяргей РЭКУН

Тэлефоны рэдакцыі:
т/факс: **8 (01562) 29-999,**
Тэл. 6-36-58, 6-36-68, 6-36-54, 6-36-44.
Velcom: **8-029-133-04-21**
Skype — gazslon
(9.00-18.00)

Для карэспандэнцыі:
231799, г. Слонім,
вул. Чырвонаармейская, д. 41
e-mail: gs@gs.by,
gazslon@gmail.com

Рэкламная служба
Начальнік рэкламнай службы
Ганна ВАЛАДАШЧУК
anna@gs.by
8-(029) 612-26-43
Супрацоўнікі
Наталля СТРУПАВЕЦ
Людміла КАМЯНЕЦКАЯ
8-(044) 715-90-03
8-(01562) 6-60-56
(9.00–16.00)
т/факс:
8-(01562) 29-000

Прыём аб'яў і падпіска:
г. Слонім, Чырвонаармейская, 73 Б
(будынак АРЗ)
Працуем аўторак — пятніца 8^{00}-17^{00}
субота — нядзеля 9^{00}-15^{00}
выхадны — панядзелак
8-(044) 762-48-39



«Давай познакомимся»

Хотите встретить свою вторую половинку, но у вас это не получается? «ГС» поможет вам найти друг друга.

Давайте объявление, приносите свои фото с кратким рассказом о себе по адресу: г. Слоним, ул. Красноармейская, 73 Б, тел. для справок 6-60-56, 8-044-762-48-39.



	утро	день	вечер
СРЕДА, **18 мая**	5⁰	15⁰	14⁰
ЧЕТВЕРГ, **19 мая**	6⁰	19⁰	17⁰
ПЯТНИЦА, **20 мая**	8⁰	20⁰	18⁰
СУББОТА, **21 мая**	10⁰	19⁰	18⁰
ВОСКРЕСЕНЬЕ, **22 мая**	10⁰	20⁰	20⁰
ПОНЕДЕЛЬНИК, **23 мая**	11⁰	25⁰	24⁰
ВТОРНИК, **24 мая**	14⁰	24⁰	17⁰
СРЕДА, **25 мая**	16⁰	19⁰	11⁰

www.meteoprog.by





Уважаемые друзья!

«Газета Слонимская» открывает новую рубрику – «От всего сердца». В этой рубрике мы разместим видео- и аудиопоздравления вашим родным, близким, друзьям, коллегам по работе, учителю и начальнику с любым торжеством: днем рождения, юбилеем, свадьбой, рождением ребенка и т.д.

Мы разработаем для Вас оригинальный сценарий поздравления. А также Вы сами сможете прислать свой поздравительный видеоролик. Аудио- и видеопоздравление будет размещено на сайте «Газеты Слонимской», на главной странице, в нужный Вам день. Видеоролик с поздравлением по Вашему желанию может быть размещен и в социальных сетях «ГС»: «ВКонтакте», «Фейсбуке», «Одноклассниках», «Инстаграме». Тел. для справок: 29-000, 8-029-61-22-643. Как подать видеопоздравление, читайте на титульной странице сайта gs.by в рубрике «Поздравления»

ВИРТУАЛЬНОЕ ПОЗДРАВЛЕНИЕ — ОРИГИНАЛЬНЫЙ ПОДАРОК, КОТОРЫЙ ВАМ ЗАПОМНИТСЯ НАДОЛГО И ОСТАНЕТСЯ НА ВЕКА В ГЛОБАЛЬНОЙ СЕТИ.

ПАЗНАЙ МЕСЦА І АТРЫМАЙ ПІЦУ!

Сябры, калі вы пазналі пабудову на фотаздымку, шліце SMS-паведамленне з адказам на нумар 8 029 133-04-21. Неабходна ўказаць адрас пабудовы — вуліцу і нумар.



УМОВЫ

➢Адказы прымаюцца **да 20 гадзін 22 траўня**.

➢Пераможцам конкурсу стане наш чытач, адказ якога прыйдзе на тэлефон **пятым па ліку!**

➢У выпадку, калі адказаў будзе менш чым пяць, уладальнікам піцы стане ўдзельнік, чыё SMS-паведамленне будзе апошнім.

➢З аднаго тэлефоннага нумара прымаецца адзін адказ.

Пераможцам мінулага конкурсу стаў наш чытач з нумарам +375 25 90ххх46. Было даслана 9 адказаў.

НАШЫ ПЕРАМОЖЦЫ



Аляксандр Гарцуеў



Адказ на мінулае заданне: пастамент помніка танку на Першамайскай вуліцы

Жанна ІВАНОВА
ФОТА АЎТАРА

Дзякуй за тое, што выбралі “Газету Слонімскую”!

Галоўны рэдактар Віктар Уладзіміравіч Валадашчук, victor@gs.by

На сайт «ГС» можно зайти с помощью QR-кода с мобильного устройства



Заснавальнік **Віктар Уладзіміравіч ВАЛАДАШЧУК**

Газета друкуецца на беларускай і рускай мовах

Рэгістрацыйнае пасведчанне №64 ад 05.03.2009 года. выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Свидетельство о госрегистрации УП «Газета Слонимская» ЮКЛ № 001845, выданное Гродненским областным исполнительным комитетом от 03.04.2003 г.

email: gs@gs.by, gazslon@gmail.com
Юрыдычны адрас: 231800, г.Слонім, вул. Чырвонаармейская, 41

Тыраж: 3 500

Падпісныя індэксы:
64042 (індывідуальная)
63818 (ведамасная)
63646 (ільготная)

Свабодны кошт

Час падпісання да друку па графіку 17 траўня 2016 года 16:00.

Аб’ём — шэсць умоўных друкаваных аркушаў.

Надрукавана ў друкарні ГАУПП «Гродзенская друкарня» г. Гродна, вул. Паліграфістаў, 4, індэкс 230025.

Заказ № 2 545